Б 85

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

XV ГОД БССР

Ба 1413

№ 13
ЛІПЕНЬ

1935
ГОД

Нашы ОРДЭНАНОСЦЫ

таварышы

ГІНАЛО і ГАЛАДЗЕД



Андрэй Александровіч

Там і тут

(Урывак з паэмы „Пагранічная вясна")

Стаю ў бярэзніку
На беразе мяжы,
І хваль вясны я чую пераклічку.
Зялёны гоман моўчкі, таямніча
На колах сполаху
Да нас перабяжыць.
Зямля Совецкая крынічнаю расой
Акропіць ласкава пялёсткавыя
крыллі
Братэрскай дружбаю, так шчыра,
Між сабой—
Пра становішча краіны гаварылі,
Я прыкладаю вуха да зямлі,
Калісь рабілі гэтак прадзеды ў
дазоры,
І чую гутарку,
А гутарку вялі
Заходня-беларускія прасторы,
Гаварылі віленскія гоні:
— Ой, вясна!
Кроў і слёзы нас палоняць
— Ой, вясна!
Вецер поле баранує,
— Ой, вясна!
Голад з пошасцю пануе,
— Ой, вясна!
Шнурам петлі на прысадах
— Ой, вясна!
Славяць карныя атрады
— Ой, вясна!
Вясна гарачая, сярдзітая вясна,
Дыміцца ўздыбленай трывогай
над зямлёю...
Вось як рукой падаць,
А гэта за мяжою—
Атручана крывёю цаліна.
Сівога веку свішча прыгавор:
— Хто квапіцца прасіць
„І хлеба, і работы"—
Гуляй—
Нямецкі звон варшаўскіх шпор,
Шляхі ўсцілай касцьмі,
Як грэблю на балотах.
Бярозка стромкая,
Сасонка, нават куст,
Жывыя сведкі дзікага разгула—
Шуршацца роспаччу жабрацтва
і пакут
Над грэбнем хваль—
Падземных грозных гулаў.
І чую сэрца гул падземны:
— Сей агонь!
Падымайся, пад'ярэмны
— Сей агонь!
У далінах Віслы, Шары,
— Сей агонь!
Край збярэ ўраджай пажараў,
— Сей агонь!
Больш агню-запалу болей,
— Сей агонь!
Воля родзіцца ў падполлі.
Сей агонь!

* * *

Як бізунамі спаласана цела
Раба-селяніна пакорнасці для,—
Спалосана поле шнурамі—надзеламі.
Ад веку вялікім няшчасцем сялян,
Палоскі-шнуры, як турэмныя
краты,
Напоены потам, слязмі і крывёй.
Я бачу ў няволі заходняга брата,
Дугою спіна—за матыкай—сахой.
Бярозавай далі зялёныя грывы
Сплятаюцца ў вузел пяшчотных
надзей.
Вясна расцвітае і сонца ў разлівах
І гоман разлівамі гневу гудзе.
Стаю на граніцы світання і
змроку.
На Захадзе кроплямі стыне зара.
А поруч—на нашых прасторах
глыбокіх
Зарніцамі песні крыляцца, гараць.
Вароты вясны раскрываюцца
насцеж,
І ў сонечны—
Нашых імкненняў—прасцяг,
Урачыстасцю заўтрашняй нашага
шчасця
Нашай рэспублікі сцелецца шлях.
І толькі—
Ледзь раніца пераступае
Туманам уночы пракладзены
мост—
Выходзіць у поле і песню
спяваюць,
І песня зліваецца з шумам бяроз:
— Узыходзіць сонца, маладое
сонца,
Гэй, да гэй!
Гоніць вецер хмары, гоніць
валаконцы,
Гэй, да гэй!
Засяваем поле, поле барануем,
Гэй, да гэй!
І спяваем песню, песню агнявую,
Гэй, да гэй!
Будзе каласіцца жыта і пшаніца,
Гэй, да гэй!
Сокам нашай працы будзе
наліваццa,
Гэй, да гэй!
А ў жніво нам праца дасць
узнагароду,
Гэй, да гэй!
Намалоцім хлеба, нарыхтуем мёду
Гэй!
Вясна ў маладым і нястрыманым
русе.
А там...
Нават гоман спалоханы сціх.
Сягоння—
Мяжуюцца дзве Беларусі—
Непараўнальныя два жыцці.

ЗОК-2/1844
Инв. № 111

15 год савецкай Беларусі

Тав. КАРТУКОЎ—загадчык сель-гас. аддзелам ЦК КП(б)Б

Сёння ўся Беларусь урачыста святкуе.

Радасна б'ецца сэрца кожнага працаўніка сёл і гарадоў БССР. 15 гадавіна вызвалення Беларусі ад белапольскай акупацыі зліваецца з другой вялікай перамогай—узнагароджаннем БССР ордэнам Леніна за выдатныя поспехі ў сельскай гаспадарцы, а таксама і прамысловасці. Былая адсталая, прыгнечаная акраіна царскай Расіі—Беларусь—сёння атрымлівае вышэйшую ўзнагароду—ордэн Леніна, як адна з перадавых рэспублік Совецкага Саюза.

Ужо няма Беларусі лапатнай, краіны сахі, бездарожжа і поўгалоднага існавання,—ёсць Беларусь магутнай прамысловасці, з моцным калгасным ладам, тысячамі трактароў, цэлай сеццю вельмі добрых дарог і 3—4 кілограмамі зернавых на працадзень калгасніка.

Беларусь стала магутным фарпостам краіны Советаў.

Поспехі нашы непарыўна звязаны з поспехамі, атрыманымі партыяй і працоўнымі Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам нашага вялікага і любімага таварыша Сталіна. Наша перамога—ёсць перамога ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, у барацьбе з кулакамі і іх агентурай—з нацдэмаўскім атрэп'ем, шавіністамі, контррэволюцыйнымі трацкісцка-зіноўеўскімі падонкамі, апартуністамі ўсіх масцей.

І святкуючы нашу перамогу, мы адзначаем герояў гэтых перамог і на франтах грамадзянскай вайны, і на фронце індустрыялізацыі, і ў барацьбе за калгасны лад. Імя ім—мільёны рабочых прамысловасці, працаўнікоў калгасных і соўгасных палёў, імя ім—дзесяткі і сотні тысяч работніц нашай прамысловасці і соўгасаў, сотні, тысячы і мільёны калгасніц.

Толькі ў Совецкай краіне, краіне дыктатуры пролетарыята жанчына атрымала поўную магчымасць нараўне з мужчынай самастойна будаваць сваё жыццё, змагацца за паляпшэнне гаспадарчага жыцця краіны.

Яшчэ не так даўно забітая, бяспраўная, надрываючая свае апошнія сілы ў цяжкай працы, асабліва ў вёсцы, жанчына цяпер у совецкай краіне, а ў тым ліку і ў Беларусі, вышла на шырокі шлях радаснай і творчай работы чалавечага жыцця, сапраўднага раўнапраўя.

Хіба думала **Мар'я Сцяпанаўна Снежко** з Дзяржынскага раёна, калгаса „9 студзеня", астаўшыся 22 гады таму назад удавой, з 5 маленькімі дзецьмі і без грошай у кішэні, убачыць калі-небудзь чалавечае жыццё?

А вось Совецкая ўлада прышла ёй на дапамогу. І зараз тав. Снежко працуе ў калгасе, з'яўляецца ўдарніцай, не гледзячы на свае 60 гадоў. Яна вырасціла для калгаса 207 штук жывёлы. Прэміравана пяць разоў. Дзяцей сваіх вывучыла.

Або ўзяць **Гаўрыленка Акуліну**, з Грэцкага раёна, калгаса „Чырвоная Беларусь". Горкай сіратою асталася яна, няграматнай і цёмнай была да калгаса, а зараз—у калгасе—новае жыццё пачалося для яе. Яна з'яўляецца перадавым барацьбітом за ўмацаванне калгаса, вядзе жорсткую барацьбу з кулакамі, прымае актыўны ўдзел у выяўленні і аддачы пад суд групы злодзеяў і зрыўшчыкаў калгаса знутры. Таварыш Гаўрыленка навучылася грамаце, скончыла курсы жанчын—актывістак і цяпер Акуліна—старшыня калгаса. Вывела яго ў першыя рады.

Сказалі-б з дзесятак гадоў таму назад **Матроне Абляцовай** з вёскі Вяжышчы, Стрэлішчанскага сельсовета, Бешанковіцкага раёна, што яна будзе старшынёй свайго сельсовета і членам урада Беларусі. Абляцова толькі-б пасмяялася. А зараз яна ўжо 6 гадоў працуе на кіруючай сельсовецкай рабоце і выбрана членам ЦВК СССР. Яе сельсовет ідзе ў радзе перадавых сельсоветаў Бешанковіцкага раёна.

А вось—**Гарбачэўская Настася Федасееўна** з таго-ж раёна—калгаса „Красавік". Ёй, не гледзячы на свае яшчэ маладыя гады, прышлося шмат батрачыць, гнуць свой горб на памешчыка—графа Бутэнава. Зараз Гарбачэўская лепшая ўдарніца. За ёй замацаваны коні. За ўдарную работу яна чатыры разы прэміравана. У мінулым годзе зарабіла 55 пудоў хлеба і больш чым 120 пудоў бульбы.

А вось **Курганава**—комсамолка—аграном—ільнавод Сененскага раёна, якая падрыхтавала за час сваёй работы вялікую колькасць палольшчыц, ільноцерабільшчыц. **Сабаленка Елена**—старшыня лепшага калгаса ў Полацкім раёне, загадчыца фермай, тав. **Багданава**, выканаўшая на 100 проц. план вырошчвання парасят.

Хіба-ж можна пералічыць так скора ўсіх нашых выдатных ударніц, стойкіх, разумных старшынь калгасаў, сельсоветаў, ударніц-брыгадзіраў, загадчыц жывёлагадоўчымі фермамі і г. д. У кожным калгасе, сельсавеце дзесяткі і сотні жанчын ударніц—брыгадзіраў, старшынь калгасаў. Па самых папярэдніх падліках, у нас, у Беларусі, больш 500 жанчын—старшынь калгасаў і сельсоветаў, да 1000 чалавек—загадчыц фермамі, больш 300 трактарыстак, 4000 брыгадзіраў паляводчых брыгад. Палова ўсіх жанчын—калгасніц ахоплены спаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Праў таварыш Сталін, калі ён на першым усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў гаварыў аб тым, што калгасны рух высунуў на кіруючыя пасады цэлы рад выдатных і здольных жанчын.

Праў і тысячу раз праў тав. Сталін, калі ён на гэтым-жа з'ездзе гаварыў: „што датычыць саміх калгасніц, то яны павінны памятаць аб сіле і значэнні калгасаў для жанчын, павінны памятаць, што толькі ў калгасе маюць яны магчымасць стаць на роўную нагу з мужчынамі. Без калгасаў—няроўнасць, у калгасах—роўнасць правоў. Няхай памятаюць аб гэтым таварышы калгасніцы і няхай яны берагуць калгасны лад як зяніцу вока".

Дзесяткі і сотні тысяч жанчын — калгасніц у Беларусі на ўласным прыкладзе пераканаліся ў праваце гэтых слоў вялікага правадыра. Яны памятаюць кожнае слова, якое кліча іх да свабоднага раўнапраўнага і заможнага жыцця і берагуць калгасы „як зяніцу вока".

Яны, гэтыя дзесяткі і сотні тысяч, памятаюць і разумеюць, што комуністычная партыя большэвікоў і таварыш Сталін у штодзенных клопатах аб жанчыне, забеспячэнні яе працы, абстаноўкі яе жыцця—усё робіць, каб змесці ўсе перашкоды на шляху жанчыны да поўнага ўдзелу ў найвялікшай будоўлі новага, прыгожага жыцця, будаўніцтве соцыялізма. Яны памятаюць і разумеюць, што прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі ў пункце аб вызваленні цяжарнай жанчыны на месяц да радоў і месяц пасля радоў з захаваннем паловы заработку, выпрацаваных у сярэднім працадзён, з'яўляецца велізарным заваяваннем жанчыны ў калгасе, і калгасніцы адказваюць на гэта яшчэ большым уздымам працоўнага энтузіязма, непахіснай вернасцю калгаснаму будаўніцтву.

У адказ на ўзнагароджанне Беларусі ордэнам Леніна на агульным сходзе калгаса „Большэвік", Каралішчанскага нацыянальнага польскага сельсовета, Менскага раёна, выступіла калгасніца **Кашнецкая** з заявай аб тым, што жанчыны калгаса, на падставе сталінскага статута, дадуць такія паказальнікі работы, якіх яшчэ не ведаў калгас. Усім было ясна, якая сіла адчувалася за гэтымі простымі і скромнымі словамі; усе былі ўпэўнены, што гэтыя паказальнікі работы жанчыны калгаса „Большэвік" сапраўды выканаюць.

У дзень, калі ўся Беларусь святкуе сваю перамогу, дзесяткі і сотні тысяч лепшых жанчын—калгасніц-ударніц, брыгадзіраў, старшынь—плячо у плячо, у адзінай шарэнзе з усімі героямі нашых перамог, з усімі працоўнымі сёл і гарадоў радасна сустрэнуць незабываемы дзень 15 гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў і дзень уручэння Беларусі вялікай узнагароды—ордэна Леніна.

Прывітанне-ж вам, лепшыя жанчыны работніцы і калгасніцы-ударніцы ордэнаноснай Беларусі!

ПІСЬМО ад нарады-курсаў жанчын-старшынь сельсоветаў пры ЦВК БССР

ЦК КП(б)Б—т. **ГІКАЛО**
ЦВК БССР—т. **ЧАРВЯКОВУ**
СНК БССР—т. **ГАЛАДЗЕДУ**

Усебеларуская нарада-курсы жанчын—старшынь сельсоветаў пры ЦВК БССР шле Вам свае палкае большэвіцкае прывітанне.

Нашу дзелавую работу абвевала шчаслівая і радасная мысль. Блізіцца вялікае свята. Неад'емная частка нашай магутнай і шчаслівай радзімы СССР — Совецкая Беларусь будзе святкаваць 15-годдзе вызвалення ад белапольскай акупацыі і ўручэнне вышэйшай узнагароды—**ордэна Леніна**.

Канула ў вечнасць праклятае мінулае, прынесенае працоўным Беларусі белапольскімі імперыялістамі і іх вернымі слугамі контррэволюцыйнымі беларускімі нацыяналістамі.

Але жыць будзе ў нас памяць аб шыбеніцах, пагромах, забойствах, грабяжах, аб дзікім нацыянальным і соцыяльным гнёце—гэтых неад'емных спадарожнікаў варварскіх акупантаў—імперыялістычных катаў. Будзе жыць і будзіць у нас няняўвісць да капіталістычнага ладу, гераічную волю да перамог, якія з'явяцца залогам перамог працоўных усяго свету.

15 год таму назад беззаветны гераізм нашай роднай Чырвонай арміі і грандыёзнае наступленне партызан і ўсіх працоўных Совецкай Беларусі пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна апракінулі зграю полчышч здыхаючага імперыялізма.

Беларусь стала свабоднай. Стала Совецкай.

Прайшло толькі 15 год, і пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пры штодзенных клопатах т. Сталіна і пастаяннай брацкай дапамозе рускага пролетарыята і працоўных усяго СССР—Совецкая Беларусь з адсталай, няграматнай, прыгнечанай царскай калоніі ператварылася ў квітнеючую, шчаслівую індустрыяльна-калгасную рэспубліку.

Выгляд Беларусі змяніўся. Пышна расцвятае прамысловасць. Няма больш забітай, цёмнай, жабрацкай вёскі. Нарадзілася—калгасная. Калгасы становяцца большэвіцкімі, а калгаснікі—заможнымі.

БССР з краіны няграматнай ператварылася ў краіну суцэльнай граматнасці. Бурна расце нацыянальная па форме, соцыялістычная па зместу культура.

Расце і колькасць жанчын, вылучаных на камандныя пасты ў гаспадарчыя, совецкія і профсаюзныя органы. Указанне т. Сталіна, што: „Жанчына ў калгасах — вялікая сіла“ няўхільна ператвараецца ў жыццё. Мы—135 старшынь сельсоветаў жанчын—гэта толькі частка вялікай арміі жанчын, якая знаходзіцца на кіруючых пастах.

Растуць новыя людзі, новыя кадры, якія лічаць справай гонару і доблесці ісці па шляху, указаному нашым мудрым настаўнікам—т. Сталіным. Наша праца, наша барацьба далі выдатнейшыя плады.

Гэтых поспехаў дабілася Совецкая Беларусь дзякуючы таму, што наша КП(б)Б на чале з лепшым сталінцам т. **Гікало** правільна ажыццяўляе ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку. Дзякуючы таму, што наша КП(б)Б бязлітасна змагаецца з контррэволюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, трацкізмам, атрэп'ямі зіноўеўска-каменеўскай групы і іншымі ворагамі партыі і рабочага класа.

Гэтыя поспехі ўдастоены вялікай узнагароды. Наша Совецкая Беларусь стала ордэнаноснай.

Гонар і радасць яшчэ больш прымушаюць нас не супакойвацца на дасягнутым, а, выпраўляючы недахопы, якія яшчэ ёсць, смела ісці да новых перамог, перамагаючы на шляху ўсякія трудносці.

Мы ведаем, што класавы вораг не дабіт яшчэ да канца, бачачы нашы перамогі ён будзе аказваць яшчэ больш жорсткае супраціўленне.

Заканчваючы нашу работу, мы абавязваемся перад партыяй, перад ЦК КП(б)Б і перад Совецкім урадам аддаць усе свае сілы на барацьбу за паспяховае ажыццяўленне вялікай задачы—пабудовы бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

Мы запэўняем, што яшчэ вышэй узнімем клясавую пільнасць, рашуча перасякаючы ўсякія вылазкі ворагаў партыі і рабочага класа.

Мы запэўняем, што геніяльныя рашэнні чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б) будуць нашай асноўнай праграмай дзеяння, выкананне якой мы цалкам і поўнасцю забяспечым.

Мы запэўняем, што ўмацаванне абароназдольнасці нашай вялікай радзімы будзе нашым першым абавязкам, і мы ўсе як адзін па першаму зову партыі станем у першыя рады яе абаронцаў.

Няхай жыве вялікі магутны Совецкі Саюз!

Няхай жыве яго неад'емная частка—Совецкая Беларусь!

Няхай жыве комуністычная партыя большэвікоў Беларусі!

Няхай жыве наш вялікі мудры настаўнік, наш друг, наш Сталін!

Таварышы **ГІКАЛО** і **ЧАРВЯКОЎ** на нарадзе-курсах жанчын-старшынь сельсоветаў.

Сельмаш

На тым месцы, дзе яшчэ не так даўно сумна шапталіся дрэвы Новікавага гаю (былыя ўладанні княгіні Паскевіч), абнесеныя высокім плотам, зараз стаяць велізарныя карпусы завода „Сельмаш".

Цяпер пры набліжэнні да гэтага месца, таксама адкрываецца малюнак лесу, але зусім іншага парадку: як лес афарбована ў светлазялёную фарбу гатовая прадукцыя завода.

Замест плота да самага ўзроўню вялікай платформы, доўгім змеем падпаўзае таварны цягнік, які адвозіць гатовую прадукцыю завода—сельскагаспадарчыя машыны ў розныя куткі нашай краіны, для работы на соцыялістычных палях.

Тэрыторыя завода з яе вялікімі карпусамі прыемна здзіўляе сваёй чыстатой і парадкам. Раскідзістыя дрэвы, шмат клумб з прыгожымі кветкамі радуюць вока.

У 1930 годзе завод уступіў у строй. Ён пабудован па апошняму слову тэхнікі. На гэтым заводзе ўжо няма круцяшчыхся над галовамі рабочых трансмісій, якія абдавалі сцены і рабочых брызгамі змазачнага масла і граззю. Кожны станок мае свой асобны матор. Вокны даюць шмат святла і блішчаць чыстатой.

* * *

Калі **Анне Іванаўне Шляхце** мінула 11 год, мачыха ёй заявіла:



Сталінская брыгада т. Новікавай.



Тав Шляхта за станком.

— Хопіць вучыцца, падпісваць навучылася і досыць. Пара дапамагаць бацькам.

Ні слёзы, ні просьбы не дапамаглі дзяўчынцы. З затаенным жаданнем вучыцца пачала Аня сваё самастойнае, свядомае жыццё. Яна пашла працаваць у садова-гароднюю арцель сваёй вёскі.

Хатнія непаладкі, лаянкі мачахі прымусілі Аню ў 1927 годзе пакінуць сям'ю. Няпрыветліва сустрэў дзяўчыну і горад. Успамінаюцца Ане доўгія дні і месяцы, праведзеныя ў бясконцых чаргах на Біржы працы і ў выніку неабходнасць паступіць хатняй работніцай. Бясконцая хатняя работа адбірала ўсякую надзею на вучобу, на які-небудзь прасвет. Але гэта даўно мінула. Пяць год таму назад Аня паступіла ў вучаніцы на завод „Сельмаш".

Зараз яна знатны чалавек завода, лепшая ўдарніца, выдатніца. Рэвальверны станок, на якім працуе Аня, заўсёды ззяе ўзорнай чыстатой. Лоўка ходзіць ў яе руках кронцыркуль. Аня комсамолка і кандыдат партыі. Яна член горсовета і рэдактар цэхавай газеты, але вялікая нагрузка ёй не перашкаджае вечарам радасна і бадзёра ісці на залікавую сесію ў вячэрні Комвуз.

* * *

Маладзёжную брыгаду **Новікавай** на заводзе ведаюць усе. Яна адна з першых пачала працаваць па вопыту Менжынцаў. Працуе ўвесь час на „выдатна". Выконвае і перавыконвае промфінплан. Яе брыгада з'яўляецца суцэльна-зотаўскай. Не дзіўна, што такая брыгада атрымала высокае званне сталінскай.

Завод „Сельмаш" — дзецішча першай пяцігодкі, з'яўляецца кандыдатам на атрыманне пераходнага сцяга. Промфінплан выконваецца па ўсіх паказальніках. Сабекошт у гэтым годзе, у параўнанні з мінулым, за пяць месяцаў зніжан на 3 проц. (па гадавому плану 5,7 проц.).

К 11 ліпеня завод прыходзіць з новымі перамогамі. З першага ліпеня завод адмовіўся ад датацыі ў суме 298 тысяч рублёў.

Рабочы калектыў завода і яго кіраўніцтва змагаюцца за тое, каб зрабіць завод не толькі рэнтабельным, але і даходным.

Крупнікава.

Гомель.

Народжаная Кнцябром

Даўно так не хвалявалася наша Лена. Лёгкай паходкай хадзіла яна з вугла у вугал па прыёмнай паліклінікі.

— Выйдзе, ці не выйдзе? Дазволяць, або не? —настойліва білася ў мазгу.

Вясёлая выскачыла яна з кабінета доктара праз 15 мін.

— Ура, дзяўчаты, зусім здаровая. Буду я, буду парашутысткай. Я вельмі адважная і вельмі дужая—працягнула яна мне з вясёлай усмешкай руку, паказваючы свае мышцы.

Лена, Лена! Як радасна глядзець на цябе. Я любуюся табой ужо даўно. Так і дышыць ад цябе энергіяй і вяселлем, настойлівасцю і дзяцінствам.

Ты прышла на фабрыку „КІМ“ у 1931 годзе. І ты і фабрыка былі тады вельмі маладыя і толькі пачыналі жыць. І праўда, раслі вы, развіваліся разам.

„КІМ“—гэта дзецішча пяцігодкі,—вядома цяпер як велізарнае соцыялістычнае прадпрыемства. А ты, вырасшая без бацькоў і прышоўшая к нам з дзіцячага дома, стала вялікім чалавекам, членам урада.

І ведаеш, Лена, мы працуем разам, мы ў адной комсамольскай арганізацыі, мы гутарым, жартуем часценька разам, але ўсё такі ўсе мы, дзяўчаты, заўсёды памятаем і ганарымся тваім званнем члена ЦВК.

У выходны дзень на фабрыцы „КІМ“.

Так прыемна расказаць тым, хто цябе не ведае, што вось у нас ёсць такая дзяўчына: яна амаль нічым не адрозніваецца ад нас усіх, а ўдзельнічае ў вялікай справе—кіраванні нашай рэспублікай нараўне з самымі лепшымі, вялікімі людзьмі нашай краіны!

Наша ўдарная работа, аданасць радзіме, уменне накапляць веды і аўладоўваць тэхнікай — усё гэта зрабіла БССР ордэнаноснай. Кожная з нас адчувае сваю долю ў гэтым ордэне. Ну, а Лена Норкіна як член Урада—адчувае гэту долю ўдвайне.

Так павернем-жа з любоўю свае вочы на Лену Норкіну і скажам цвёрда:

— Пабольш такіх дзяўчат, якія ўмеюць і сур'ёзна працаваць, і адважна прыгаць з парашутам, і культурна расці. Будзем-жа і мы такімі, як наша Лена!

Турык В.

Віцебск, фабрыка „КІМ“.

Сёстрам Заходняй Беларусі

У гэтыя дні людзі па мястэчку хадзілі як цені: белапалякі блізка. Колькі страху, колькі боязні перад будучынай было ў гэтых словах.

Я тады была маленькай дзяўчынкай і не зразумела чаго так баяцца белапалякаў. Раніцой, калі вокны нашай старэнькай хаткі пачалі рассыпацца ад стрэлаў кулямётаў і снарадаў, я зразумела, што страх дарослых быў недарэмным. Праз некалькі гадзін белапалякі ўвайшлі ў мястэчка. Адразу-ж яны пачалі рабаваць, здзекавацца над насельніцтвам.

Майго бацьку яны забралі і пратрымалі пяць дзён. Прышоў ён абарваным, без сапог і паўшубка. Мы радаваліся, што застаўся ў жывых. Бацьку яны забіралі некалькі разоў. Нехта з панскіх прыслужнікаў данёс, што ён служыў у Чырвонай арміі.

Нямала белапалякі здзекваліся і нада мной. Яны прымушалі абслугоўваць іх, а калі ім здавалася, што я дрэнна чышчу бульбу, то адразу браліся за плётку.

Не пазнаць зараз гэта мястэчка (Камень, Лепельскага раёна). У калгасе былая беднота знайшла шчаслівае жыццё. Не менш шчаслівы і тыя, якія паехалі ў горад работаць, ці вучыцца. Да гэтых належу і я.

Працую я работніцай на Віцебскай фабрыцы „Сцяг індустрыялізацыі“. Зотаўка і лепшая ўдарніца. Добра зарабляю. Работаю на 7 разрадзе. Прафорг брыгады.

Дзень 15-годдзя вызвалення Беларусі ад белапалякаў для мяне, як і для ўсіх працоўных, з'яўляецца вялікім святам. Я ганаруся тым, што наша Беларусь стала ордэнаноснай і перадавой рэспублікай у Совецкім Саюзе.

Хочацца мне вам, сёстрам па класу,—работніцам і сялянкам Заходняй Беларусі, сказаць:

— Глядзіце як нам добра!

Бярыце ад нас прыклад!

Свістунова.

ПРОЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА

У некалькіх кроках ад запалкавай фабрыкі „Пролетарская перамога“ стаіць невялікая пабудова. Тут раней была фабрыка Бермана, пад назвай „Березина“. 250 рабочых працавалі ў брудных цэхах, у жудасных умовах. Прадукцыі ў суткі выпускалася—200 яшчыкаў.

Хіба можна параўнаць гэта



Тав. Трымайлава член ЦВК БССР

з цяперашняй совецкай фабрыкай—гігантам, у якой працуе 1800 рабочых (у тым ліку 80 проц. работніц) з выпускам прадукцыі ў суткі—3 200 яшчыкаў?

Запалкавая фабрыка „Пролетарская перамога“ — дзецішча першай пяцігодкі—уступіла ў строй у 1929 годзе. Фабрыка пабудавана па апошняму слову тэхнікі. Усе працэсы механізаваны.

У цэхах многа прасторы і святла. Асабліва прыгожы выгляд мае каробачны цэх. Гэта—вялікая зала, з шкляным паталком і шматлікімі вокнамі. Бліщчаць на станках медныя клеянкі, на кожным станку—вазон.

Ля фасада фабрыкі весела б'е фантан. Кругом разбіты клумбы. Тут, на свежым паветры, у абедзены перапынак адпачываюць рабочыя. Праводзяцца галосныя чыткі газет і гутаркі.

Ёсць свой парк культуры і адпачынку, клуб і гукавое кіно. Дзеці работніц знаходзяцца ў добра абсталяваных яслях і дзіцячым садзе. Хутка ў лесе будзе гатова дача для дзяцей.

Пабудаваны тры інтэрнаты. У пакоях узорная чыстата і ўтульнасць. Асабліва добра абсталяваны два пакоі для ўдарніц.

На вялікіх вокнах—прыгожыя фіранкі. Сцены ўвешаны партрэтамі правадыроў. Стаяць ложкі з пружыновымі матрацамі. Каля кожнага ложка—тумбачка, пакрыта прыгожа вышытай сарветкай. Ёсць дзве шафы, дыван. Сталы пакрыты абрусамі, кругом—крэслы. У пакоі вялікая люстра, вазоны. На падлозе ляжыць дарожка.

* * *

Фабрыка першай ў Барысаве і першай сярод запалкавых прадпрыемстваў Саюза к 1-му маю гэтага года стала суцэльна-тэхнічна граматнай. Рыхтуюцца кадры. Лепшыя ўдарніцы **Шапчыц** і **Патаповіч** вучацца на курсах дырэктароў у Маскве, 7 работніц—на курсах начальнікаў цэхаў. 491 чалавек займаюцца ў вышэйшых тэхнічных гуртках. На фабрыцы ёсць 9 майстроў—работніц.

За пяць месяцаў 1935 года фабрыка „Пролетарская перамога“ выканала промфінплан на 115 проц. Сабекошт прадукцыі зніжан на 7 проц. За пяць месяцаў фабрыка мае 300 тысяч рублёў прыбытку. За ўзорную работу „Пролетарская перамога“ прэміравана Наркамлесам СССР легкавой машынай.

Гэтыя поспехі—трыумф ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Гэтыя перамогі мы атрымалі пад кіраўніцтвам нашай партыі пры дапамозе пролетарыята ўсяго Саюза.

* * *

15 год таму назад белапольскія акупанты зруйнавалі горад Барысаў і запалкавую фабрыку „Березина“.

Аб жудасным часе, калі гаспадарылі польскія паны, асабліва, калі яны пад напорам непераможнай Чырвонай арміі вымушаны былі адступаць, успамінаюць цяпер старыя работніцы. Гэтыя людзі раней былі забітыя, няграматныя. З імі ніхто не лічыўся. Сёння—гэта лепшыя, знатныя людзі на прадпрыемстве і ва ўсім раёне.

Надзея Марфель працуе на фабрыцы 28 год. Яна прайшла ўсе этапы эксплаатацыі на фабрыцы Бермана. Зараз член партыі тав. Марфель старшыня фабрычнага камітэта.

У часе адступлення белапалякаў, пад кіраўніцтвам Барысаўскай большэвіцкай арганізацыі на фабрыцы „Березина“ быў арганізован рабочы камітэт для аховы фабрыкі і сувязі з арганізацыяй. У рабочым камітэце тав. **Марфель** прымала актыўны ўзел.

Белапалякі пры адступленні зруйнавалі фабрыку, забралі многа частак машын і вывезлі тавар. Частку яны кінулі ў рэчку. На прадпрыемстве асталося 150 рабочых. Машыны ўсе былі схаваны. Белабандыты хацелі забраць машыны, але ўсе рабочыя як адзін гэтага не дапусцілі.

Агафья Іванаўна Емельянава працуе 29 год на фабрыцы.

— Мне добра запамяталася белапольская акупацыя—расказвае яна.— Акупанты з асаблівай асалодай здзекваліся над працоўнымі яўрэямі. Гвалтавалі жанчын, забівалі дзяцей.

Перад адступленнем акупанты спалілі горад Барысаў і мост праз Бярэзіну. Зруйнавалі чыгуначны мост. Калі абстрэльвалі фабрыку, нашы рабочыя і работніцы збераглі яе ад пажара.

Хутка да нас дайшлі весткі, што блізіцца перамога—Чырвоная армія недалёка. Нарэшце дачакаліся гэтага шчаслівага

Чытка газет у сям'і тав. Жоўкевіч.

дня. Чырвоныя палкі вызвалілі нас ад белабандытаў.

З першага-ж дня рабочыя сталі дапамагаць рамантаваць мост. Я сама пасля работы хадзіла на дапамогу.

Так мы пачалі будаваць сваё новае жыццё пры совецкай уладзе і, як бачыце, добра мы пабудавалі. Я ганаруся, што жыву ў такі час.

І сапраўды, ёсць чым ганарыцца Емельянавай. Яна член партыі, майстар каробачнага цэха, лепшая ўдарніца. Яе змена дае высокія паказальнікі.

Не менш знатны чалавек—**Сара Блох** з 33-гадовым вытворчым стажам. Яна працуе цяпер на фарбовачных машынах. Гэта—лепшая ўдарніца—герой першай пяцігодкі, выдатніца. Яна мае гонар быць членам прэзідыума барысаўскага горсовета. Дачка тав. Блох—Берта—таксама лепшая ўдарніца—брыгадзір другога этыкеровачнага цэха.

Фядора Іванаўна Жоўкевіч—зменны майстар каробачнага цэха, працуе 30 год на вытворчасці. Яна таксама нямала перажыла ў 1920 годзе.

— Брат мой тады знаходзіўся у Чырвонай арміі — расказвае Жоўкевіч. Калі ён быў на пабыўцы, то пакінуў шынель. Мы забыліся схаваць яе. І вось за гэта мы ледзь жыццём не паплаціліся, — да поўсмерці збілі нас. Калі Чырвоная армія прышла, нам адразу выдалі мануфактуру і іншыя рэчы.

Тав. Жоўкевіч нядаўна ліквідавала сваю непісьменнасць, уступіла ў партыю і цяпер яна добра вучыцца ў кандыдацкай школе.

Трымайлава Ірына Ульянаўна—працуе 35 год на вытворчасці. Яна прыёмшчык—каробачна-этыкеровачнага цэха. У гэтым годзе ў Трымайлавай адбылася вялікая радасць—яе выбралі членам ЦВК БССР, членам горсовета і райвыканкома.

Майстар цэха тав. Шапчыц прапрацоўвае з спачуваючымі статут партыі.

Нядаўна Барысаўскі горсовет накіраваў тав. Трымайлаву, разам з дэлегацыяй, у горад Бабруйск па праверцы спаборніцтва паміж абодвума гарадамі.

Многа яшчэ ёсць такіх людзей, выхаваных на соцыялістычнай фабрыцы „Пролетарская перамога" за 15 год ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Нова-Барысаў. **Е. Эпштэйн.**

АБ ЖЫЦЦІ КОМУНІСТАЎ

Я належу да тых людзей, якія радасць жыцця адчулі толькі пры совецкай уладзе. Мне 62 гады, але адчуваю сябе яшчэ маладой. Працую работніцай на фабрыцы „Сцяг індустрыялізацыі" і прымаю актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. З'яўляюся парторгам ленты і членам парткома.

У сваёй рабоце я больш за ўсё звяртаю ўвагі на выхаванне партыйцаў, на добрую пастаноўку масавай работы ў ленце. Мяне цікавіць не толькі тое, як комуніст працуе, але і як ён жыве. Часта бываю дома ў комуністаў не толькі сваёй партгрупы, але па даручэнню цэхавага парторга і ў другіх комуністаў.

Нядаўна была ў рабочага комуніста тав. **Кейтліна**. Спадабалася мне як ён жыве. Адразу адчуваецца, што гэта сям'я комуніста. Дзеці добра выхоўваюцца. Жонка хоць і хатняя гаспадыня, але прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце жакта.

А вось у комуніста **Гендзера** жыццё зусім другое. Хоць ён больш развіты таварыш і працуе на адказнай рабоце ў цэху, жонка яго зусім адсталая, і зразумела чаму: заўсёды яна сядзіць адна з трыма дзецьмі ў хаце. Партгрупа ўказала тав. Гендзеру на недапушчальнасць такіх адносін да сям'і.

Асабліва сачу я за вучобай комуністаў. Кандыдат партыі тав. **Ерхель** не наведвала школу і наогул была пасіўнай. Я з ёй многа разоў гутарыла. Паставіла пытанне аб гэтым на партгрупе і парткоме і яна падцягнулася. Тое-ж самае было з тав. **Івановай** і іншымі.

Сама я вучуся ў соўпартшколе. Акуратна 8 разоў у месяц наведваю заняткі. Я адчуваю, што вучоба прыносіць мне вялікую карысць у практычнай рабоце.

У комуністычным духу выхавала я сваю дачку. Яе маладосць праходзіць радасна і шчасліва. Па сканчэнні сямігодкі,

Тав. **Марковіч.**

яна паступіла ў фабзавуч швейнікаў, потым працавала на фабрыцы. Была на комсамольскай рабоце, а зараз вучыцца ў Маскоўскім комвузе імя Свярдлова. Хіба гэта не вялікі гонар для мяне? Ад аднаго гэтага хочацца мне жыць і яшчэ лепш працаваць на карысць нашай дарагой Совецкай краіны.

Марковіч Р.

Віцебск.

Індустрыяльная Беларусь

СОВЕЦКАЯ

1. Дом ураду БССР у Мінску. 2. Фабрыка „КІМ“ у Віцебску. 3. Інтэрнат фабрыкі „КІМ“ у Віцебску. 4. [illegible] кладцы новай дарогі да калгаса „Чырвоны баец“. 6. Шасейныя дарогі Совецкай Беларусі. 7. Сталі[illegible]ыя „Чырвоная зорка“ Барысаўскага раёна ў час абедзенага перапынку іграюць у даміно. 10. Брыгада [illegible] ка у калгасе „10-годдзе БССР“, Рэчыцкага раёна. 12. Швейная фабрыка „Сцяг індустрыялізацыі“ (Віцебск). 15. У матальным цэху Магілеўскай шоўкавай фабрыкі. 16. Першы калгасны ра[illegible]іль

...калгаская БЕЛАРУСЬ

...Комунальны дом у Віцебску. 5. Жанчыны калгаса „Камінтэрн“ Барысаўскага раёна на праныя конi на калгасных палях БССР. 8. У інтэрнаце ф-кі „КІМ“ у Віцебску. 9. У калгасе ...каменшчыкаў калгаса „Чырвоны баец“ Барысаўскага раёна мосцяць скотны двор. 11. Яслі ...). 13. Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат. 14. Дзіцячы сад № 3 чыгуначнікаў у Оршы. ...ільны дом у БССР (Менскі раён, калгас „Окцябрская рэволюцыя“).

ДОКТАР ХОЦІМСКАЯ

Талантлівая, настойлівая, поўная энергіі **Шыфра** шукала выхаду з жудаснага кола гнёту і бяспраўя, якім царскі ўрад падаўляў усе нацыянальныя меншасці.

Свае дзіцячыя юнацкія годы Шыфра пражыла ў Суме (Украіна) і там-жа скончыла гімназію. Бацька—стары шапачнік, матка—панчошніца нічога ёй не маглі дапамагчы ў яе імкненнях працягваць вучобу.

... Доўгія ночы вучылася Шыфра ў маткі вязаць панчохі. Як рамесніца яна—яўрэйка заваявала сабе права жыць у горадзе Харкаве.

Нарэшце Шыфра дабілася свайго. Яна паступіла ў інстытут на медычны факультэт. Пацяклі радасныя, але трывожныя і поўныя лішэнняў дні. Трывожныя таму, што кватэрная гаспадыня і іншыя не павінны былі ведаць, што Шыфра вучыцца ў інстытуце.

Зіма... Вечар...

Шыфра бяжыць дамоў. Хочацца адагрэцца, адпачыць пасля лекцый у інстытуце і бегатні па ўроках. Але дома яе чакаў „сюрпрыз", якога яна ўвесь час баялася. Пакойчык яе на замку і рэчы выкінуты, а кватэрная гаспадыня з зларадnай усмешкай паднесла ёй абвестку аб высяленні з кватэры і з горада, як не законна ў ім пражываючай.

Слёзы брызнулі з вачэй. Сэрца напоўнілася ненавісцю к праклятым законам, к тым, каму яны служаць.

Не давялося спаць Шыфры ў гэту ноч. Тысячы планаў складаліся і адразу разбураліся ў яе галаве. Адно для яе было ясна — не адступаць. Настаяць на сваім.

* * *

1919 год. Владзікаўказ асаджаецца белымі казацкімі бандамі. Ваенны паходны госпіталь перапоўнен раненымі. Большасць дактароў уцяклі к белым, засталіся толькі хірург Мядзвецкі і толькі што скончыўшая медычны факультэт **Шыфра Хоцімская.**

Атрымаліся радасныя весткі, што тыя хворыя, якіх можна



было перавозіць, былі вывезены з госпіталя бесперашкодна. У тым ліку былі буйныя палітработнікі.

Раз'юшаныя белыя банды ўступілі ў горад. Многа ахвяр панёс у гэтую ноч Владзікаўказ. Загінуў у гэтую ноч і хірург Мядзвецкі.

Ненавіснымі Шыфры былі белыя банды. З вялікімі цяжкасцямі ўдалося ад іх уцячы. У снежні месяцы яна ўступіла ў атрад чырвонай конніцы. Заўсёды ў першых радах для аказання дапамогі параненым. Ва многіх гераічных баях першай коннай арміі ўдзельнічала Шыфра Хоцімская.

Асабліва запамятаваўся ёй бой пад Жыватовым супроць добра ўзброенай пазнанскай дывізіі. Сваёй самаахвярнасцю ў гэтым баі Шыфра заваявала павагу ўсіх байцоў.

У 1924 годзе Шыфра Грыгораўна развіталася з дарагім і блізкім ёй палком. Трэба было перайсці на новы фронт, на фронт аховы здароўя працоўных, будуючых соцыялізм.

Цяпер Шыфра Грыгораўна намеснік галоўнага ўрача сухотнай бальніцы ў Нова-Беліцы. Яна і тут карыстаецца агульнай любоўю.

Шыфра Хоцімская вопытны доктар, чулы чалавек і добры арганізатар. Яна сваёй адданасцю справе і асабістым прыкладам вучыць другіх як трэба працаваць.

Для Шыфры Грыгораўны не існуе цяжкасцей. Таго-ж яна патрабуе і ад другіх.

— Яна ў нас строгая,—кажа сястра Крысінская Міля. Не любіць расхлябанасці, патрабуе дысцыплінаванасці і чоткасці ў рабоце.

Скромны чалавек тав. Хоцімская! Яна ніколі не гаворыць аб сваіх заслугах перад рэволюцыяй і лічыць, што кожны на яе месцы павінен быў зрабіць тое самае. Але краіна помніць сваіх герояў. У дзень 15-годдзя слаўнай коннай арміі, **пастановай ЦВК СССР Шыфра Грыгораўна Хоцімская ўзнагароджана ордэнам чырвонай звязды.**

Фрадзіна.

Нова-Беліца.



Нова-Беліцкая туберкулёзная бальніца, пабудаваная ў 1932 годзе.

ЖОНКІ КАМАНДЗІРАЎ— УДАРНІЦЫ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

На прасторнай сцэне лагернага тэатра, на фоне прыгожых дэкарацый, пад гукі духавога аркестра, плаўна і рытмічна рухаецца група танцораў. Выконваецца лезгінка і народны лубок. Гэта—энтузіясткі чырвонаармейскай самадзейнасці, жонкі камандзіраў—**Румянцава, Кальянава, Тупік і Буднік** разам з кіраўніком балетнай групы—курсантам **Шмаргоціным**.

Але не толькі па танцах ведаюць камандзіры, байцы і палітработнікі сваіх актывістак—„акторак". Таварышы **Кальянава, Янушэўская, Панасюк** з вялікім поспехам выступаюць і ў п'есах. Не дарма яшчэ да выезду ў лагеры былі пастаўлены такія п'есы, як „На границе", „Мятеж", „Сказка про Бову" (з п'есы „Князь Мстислав Удалой") і рад інсцэніровак.

Жонка камандзіра тав. **Панасюк**, не гледзячы на сямейныя абставіны (грудное дзіця), заяўляе:

— Трэба нам дапамагчы ў пастаноўцы. Апрача нас няма каму выканаць жаночыя ролі.

Яна не прапускае ніводнай рэпетыцыі.

Не абходзіцца і без кур'ёзаў. Аднойчы, калі тав. **Янушэўская** выконвала арыю з оперы „Кармен", да яе з публікі важна накіраваўся, проста на сцэну, трохгадовы сын:

— Мама, спяваеш? Ну, ну, спявай, я люблю цябе слухаць. Толькі дай я каля цябе пастаю.

Але, наогул, маленькі Юрык ніколькі не перашкаджае Янушэўскай своечасова прыходзіць на заняткі драмгуртка, займацца пошукамі касцюмаў і рэквізіту, усямерна садзейнічаць павышэнню якасці спектакля.

Іншы раз, праўда, да кіраўніка лагернай самадзейнасці т. **Касцянава** звернецца каторая:

— Што рабіць, тав. рэжысер, абед не гатоў, дзіця плача, проста ратунку няма, а ў пяць—рэпетыцыя...

Але памеркаваўшы крыху, сама знаходзіць выхад... Выратоўвае суседка з гарадка начсклада, або муж...

У бліжэйшыя дні аб'яднанымі сіламі драмгурткоў часцей лагернага збору будзе паказана п'еса ў 4 дзеях **„Амба"**, у якой галоўныя ролі выконваюць жонкі камандзіраў **Геновкер** і **Кальянава**. Адначасова рыхтуецца вялікі канцэрт.

У палатняным гарадку, побач з напружанай баявой вучобай за аўладанне складанай тэхнікай крыніцай струменіць масавая самадзейнасць, поўная запалу, бадзёрасці і агня. У гэтым разумным адпачынку байца, камандзіра і палітработніка значны ўдзел прымаюць жонкі камандзіраў Чырвонай арміі—актыўныя грамадскія работніцы.

Дапамагаючы арганізаваць разумны адпачынак чырвонаармейцаў, жонкі нашых камандзіраў тым самым спрыяюць узмацненню абароназдольнасці непераможнай Чырвонай арміі—вартавога соцыялістычных межаў нашай вялікай радзімы.

Юр. Лявонны.

Тав. **Ефімава**—брыгадзір механа-зборачнага цэха завода імя Варашылава—варашылаўскі стралок.

МАЯ ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЦЁ

Што чакае дзіця працоўнага ў капіталістычнай краіне, які пазбаўляецца бацькоў і астаецца круглай сіратой?

Жабрацтва і голад. Толькі не многім выпадае шчасце пачуць ад „добрачынных" дам слова „бедная сіротка" і атрымаць дзе-небудзь талерку супа. Мяне спаткаў-бы такі-ж самы лёс, калі-б я не жыла ў вялікім Совецкім Саюзе.

Тав. **Далганава.**

Бацька мой загінуў у часе стачкі на Сормаўскім заводзе, матка памерла ад халеры, а брат забіт на паўднёвым фронце ў часе грамадзянскай вайны. Пяцігадовай дзяўчынкай падабралі мяне і аддалі на выхаванне ў Віцебскі дзіцячы дом імя Калініна. У ім я пражыла 12 гадоў.

У 1933 годзе дзіцячы дом паслаў мяне вучыцца ў Магілеўскі ветэрынарна-зоатэхнічны рабфак. У гэтым годзе я яго паспяхова скончыла. Уступіла ў комсамол. Прымаю актыўны ўдзел у грамадскай рабоце.

Мая мэта—стаць спецыялістам па жывёлагадоўлі. Я паступаю вучыцца ў Віцебскі ветэрынарны зоатэхнічны інстытут. Ударнай вучобай у інстытуце і актыўнай барацьбой за вырошчванне соцыялістычнай жывёлы я пастараюся аплаціць маёй краіне рахунак за атрыманую пуцёўку ў жыццё.

Далганава.

Магілеў.

Młode, szczęśliwe pokolenie

Józek, Aniela, Janka, Wala, Witek i jeszcze kilku dziarskich wesołych dzieciaków bawią się na równym usypanym piaskiem placyku ogródka dziecięcego. Różne zabawki — słonie, bryczki, piłki, samochody, ustawione w jedną linję, miały oznaczać przygotowanie do «ataku».

6-cioletni Tolo gra rolę «Czapajewa». Energicznie wywija szabelką, galopując na rumaku z kija, z garścią włosów końskich na końcu. I gdy waleczny «Czapajew» miał zginąć pod ciosami zbliżającego się słonia (wyobrażającego białą armję), Tolo, nie podnosząc rąk do góry, rzuca komendę: «Poddaj się, lepiej będzie, bo ci ryj przetrącę». Dzieci, grające czapajewców, pośpieszyły na pomoc do swego dowódcy. Tolo nie składa «broni» i opuszcza pole «bitwy» tylko wówczas, gdy słoń z zadartemi nogami leżał «śmiertelnie zraniony» przez bitnego «Czapajewa».

Gra w «Czapajewa» i inne zabawy nigdy nie nudzą pełnokrwistych «bąków» z ogródka dziecięcego polskiego kolektywu im. Karola Marksa. Ciągły gwar i wesoły szczebiot dzieci na podwórzu...

***

Wychowawczynie ogródka a zarazem i żłobka dziecięcego, który mieści się w tymże ślicznym, specjalnie wybudowanym gmachu kolektywnym, umieją cenić radość dziecięcą i zdrowie przyszłej szczęśliwej zmiany.

Młoda kierowniczka ogródka *Iwaszyn Marja* i jej pomocnice *Zofja Horbatowicz, Marja Apranicz* i kucharka *Aleksandra Czumakowicz* troskliwie doglądają dzieci, zawsze są z niemi i wesoło je zabawiają.

Matki są spokojne o los swych małych. Ogródek i żłobek dziecięcy uwolnił ich od kłopotów domowych.

Oto kolektywnica Dziedziulo. Ma 5-cioro dzieci, drobnych jak mak.

Bywało, jeszcze koguty nie pieją, a Marja już na nogach. Do świtu wypali w piecu i biegnie w pole żąć zboże. Brała zwykle ze sobą kołyskę. I przez cały upalny dzień dziecko smarzyło się na słońcu.

Żnie, a w głowie się snuje nieprzeparta myśl o małych, co same w domu gospodarują.

— Może już chatę zapaliły, albo którego koń stratował kopytami. Nieraz te myśli zrywały Marję z miejsca. Próbowała biec do domu, lecz najmłodszy co chwilę się budził i przeraźliwym u-a, u-a wołał matkę do siebie.

W taki to sposób cierpiała Marja, siedząc jeszcze na swym zagonie jednostkowym, a nawet w roku 1930, gdy we wsi Lachowicze powstał kolektyw.

A teraz dzieci Marji są w ogródku dziecięcym, a najmłodszy— w żłobku.

Dziedziulo wyrabia półtory normy na pieleniu, a za nią idą pozostałe kolektywnice. Len w kolektywie już dwukrotnie został przepielony, jare też odchwaszczono. Sprawnie idzie robota w kolektywie, właśnie dlatego, że zarząd kolektywu i wszyscy kolektywnicy dbają o to, by dzieci ich były zdrowe, wesołe i rozwinięte...

***

W schludnem pomieszczeniu, o widnych oknach, zawieszonych firankami, w lśniących od bieli łóżeczkach dzieciaki odpoczywają po obiedzie. Martwa cisza. Horbatowicz, stąpając na palcach, zbliża się do budzącego się dziecka i, pocichutku nucąc piosenkę uspakaja małego.

Upływa kilka minut, wszyscy śpią...

Po dwugodzinnym odpoczynku dzieci wstają, myją się. Każdy ma ręcznik, kubek, szczoteczkę do zębów i wieszak do ubrania. Do kolacji — zabawy, pieśni.

Odżywianie dzieci — doskonałe. Mleka, mąki pszennej, jaj, tłuszczu — poddostatkiem. Do żniw ogródek będzie miał wieprza. Teraz się hoduje i już ze trzy pudy waży.

***

... Czteroletnia Lilja zawołała Zosię i cichutko zapytuje:

— Powiedz Zosiu, jak na imię tego dziadzi co to o... Zosia szybko odpowiada: — to Czerwiakow, on w Mińsku pracuje, a obok wiszący portret Lilja sama daje prawidłowe odpowiedzi... — to Hikało, a to Hołodzied, a tam dziadunio Lenin — i dodaje: — on umarł...

I zebrawszy wszystkie dzieci Iwaszyna zapytała:—Dzieci, gdzie mieszkamy?, dzieci chórem odpowiedziały — w Związku Radzieckim... i u nas burżujów niema. Śmiały Tolo dodał:—Tata wygnał kułaka Filipowicza, a dom pozostał nasz. Tu my teraz bawimy się.

Dziwić się tylko należy i być dumnym z tej najszczęśliwszej przyszłej zmiany bolszewików.

Takich ogródków dziecięcych, jaki jest w kolektywie im. Karola Marksa, jest wiele w pogranicznym rejonie Dzierżyńskim. Mamy to tylko dlatego, że już od piętnastu lat lud pracujący pod kierownictwem partji i mądrego Stalina żyje bez ucisku, bez panów, kapitalistów i bez księży Czapskich, Radziwiłłów.

W. Romanowski



Тав. **Жураўская**—калгасніца (Самахвалавіцкі сельсовет) заняла другое месца ў беге на 500 метраў.

אקטיוויסט דויבעשלונג

איז דער געבײַדע פון פארטיי־קאבינעט, ווו מיר האָבן זיך איצט פארזאמלט איז מיט 15 יאָר צוריק געווען די ווײַספוילי־שע זשאנדארמעריע. דאָ האָט מען ארויס־געטראָגן טויט־אורטײל פאר אסאכ אר־בעטער אונ ארבעטנדיקע, דאָ האָט מען געשמיסן, געשלאָגן מיט שאָמפאָלן איבער די פיאטעס, געשטאָכן מיט נאָדלען אונ־טער די נעגל.

בא אונדז אלעמען האָט זיך גוט איינגעקריצט איז זיקאָרן דאָס פײַניקן אונ די לײַדן, וואָס מיר האָבן איבער־געטראָגן פון די ווײַספאָליאקן. מיר ווילן דערציילן דאָס, וואָס מיר האָבן איבער־געלעבט אונ וואָס עס האָבן איבערג־לעבט אסאכ ארבעטער אונ ארבעטנדיקע פון ווײַסרוסלאנד אונטער דעם יאָך פון דער ווײַספריצישער אָקופאציע. מיר ווילן דערציילן וויאזוי אונדזער שטעטל אונ גאנצ סאָוועטן־ווײַסרוסלאנד האָט פאר די די 15 סאָוועטישע יאָרן, באקומען די מעגלעכקײַט צו ווערן אקטיוע בויער פון סאָציאליזם.

צווישן די וואָס האָבן זיך דאָ צונויפ־געקליבן זײַנען דאָ געווען אָרעמע אײנצל קוסטארן, שוסטערס, שנײַדערס, באלעגאָלעס, אלמאָנעס, וועלכע זײַנען געבליבן לעבן נאָכ די פאגראָמען פון די ווײַספאָליאקן, באלאכאָוויטשעס אונ קא־ראָטקעוויטשעס באנדעס.

ווילן מיר דערציילן וויאזוי די סאָוועטן־מאכט האָט אונדז ארויסגעפירט אפן ברייטן שליאך צו א גליקלעכן לעבן פון פארמעג־לעכקײַט, פון קולטורעלקײַט, וויאזוי די סאָוועטן־מאכט איז געווען א מוטער פאר אונדזערע קינדער.

זארעצקאיא בראָכע

איך האָב אָנגעהויבן מײַן וועג פון א דינסט, פאר 8 רובל א יאָר. מײַן טאטע האָט געהאט 2 פארנאָסעס, זומער האָט ער ציגל געמאכט אונ ווינטער פלעגן מיר נעמען די זעג אונ האק אונ גייג האקן האָלץ. פארדינט האָבן מיר צו 5 קאָפיקעס א טאָג.

די ווײַספאָליאקן אונ די באלאכאָוצעס האָבן אָפגעריניקט אלץ וואָס איז געווען איז שטוב, דעם מאן מײַנעם האָט מען אונטערגעהאנגען, אונדז האָט מען געש־לאָגן אונ צוגענומען די בהיימע.

קאראטקעוויטשעס באנדע האָט פאר־גאנצט די צאָרעס, זיי האָבן מײַן מאן געהארגעט. זײַנען מײַנע קינדערלעך געבליבן אָן א טאטן. וואָס וואָלט איך מיט זיי געטאָן וועג ניט די סאָוועטן־מאכט? מײַן אוועמל עגדיקט איצט אפ אינ־

א טעמפלע, איז זי געווען א געהילפ־נא־טשאלניק פון אן אײַזנבאן־סטאנציע, איצט לעבט זי זיך. מײַנע 2 יינגערע לערנען זיך אין שול.

פיליפאָוויטש פליאר

אָט אָ דאָ, וווּ מיר זיצן איצט האָט מען געשלאָגן מיט שטעכיקע דראָטן. מע פלעגט שלאָגן אונ הייסן אונטערשטעלן די היטל די בלוט זאָל רינען אין היטל אונ ניט אפן דיל. איך האָב אויך געהאט „דעם פארגעניגן" צו פארזוכן 50 נאהײַקעס.

ניט לאנג האָבן זיך די ווײַס־פאָליאקן געהאלטן. די דויטע ארמיי האָט זיי ארויסגעיאָגט, אָבער ניט אזוי לײַכט האָבן זיך די פריצים געוואָלט צעזעג־נען מיט זייערע מאיאָנטקעס. די ארומיקע באלעגופים, פריצישע זינדלעך גיבן זיך ניט אונטער אונ זיי האָבן אָרגאניזירט באנדעס. בייס דעם באנדיטישן אָנפלי, אָט וויי איצט זע איך אלטער דרייער וועלכן זיי האָבן צום טויט ניט דערשלאָגן. ער וואלגערט זיך אין גאס אונ בעט זיך מע זאָל אים געבן אביסל וואסער. קראסאָוס־קאיא יעלענא, מײַנע א שכיינע, האָט אים ארויסגעטראָגן אביסל וואסער, דערפאר האָבן די באנדיטן זי געוואָלט הארגענען.

אסאכ וואסערן זײַנען שוין פון דאן אָן אוועקגעשוווומען. די וווּנדן וואָס מיר האָבן באקומען פון די ווײַספאָליאקן, פון ־אלאכאָוויטשן אונ קאראטקעוויטשן האָבן זיך שוין לאנג פארהיילט. מיר האָבן זיך־ײַך אויסגעפילט דעם ערשטן פינפיאָר אונ מיט גרויס דערפאָלג פילן מיר אויך די בויונג פון צווייטן פינפיאָר, מיר האָבן אין 1930 י. אָרגאניזירט א קאָלווירט, מיכ האָט מען אויסגעווילט אלס פאָרזי־צער, געווען זײַנען אין קאָלווירט 18 מישפאָכעס, איצט האָבן מיר שוין 120 מישפאָכעס. בא אונדז אין קאפאָטקע־ווישט זײַנען דאָ 3 מעכטיקע קאָלווירטן. מיר פירן איצט א גרויסע אופקלערונג־אר־בעט צווישן די קאָלווירטניקעס ארום צו־נויפגיסן די 2 קאָלווירטן „איסקרא לעני־נא" אונ „רויטער אָקטיאבער" אין אייו קאָלווירט. דאָס וועט נעבן א מעגלעכקײַ־די ווײַסרוסישע אונ ייִדישע קאָלווירטני־קעס נאָכמער פארפעסטיקן אונדזער מעכ־טיקײַט, נאָכמער פעסטיקן אונדזער אין־טערנאציאָנאלע בריידערונג. די קאָלווירטני־קעס זײַנען צופרידן פון דער דאָזיקער צונויפגיסונג.

יעדער אײַנציקער פון שטעטל וואָלט אויך דערציילט דאָס זעלבע, ער וואָלט אײַך דערציילט וועגן די איבערלעבונגען בייס דער ווײַספוילישער אקופאציע, וועגן בײַע אויסגעוואקסענע מענטשן, פאר 15 יאָר סאָוועטן־לעבן, וועגן פארמעגלעכע קאָל־ווירטניקעס אונ אויסגעוואקסענע ארטעלן, וועגן די פערספעקטיוון פון שטעטל, וועגן דעם נײַעם קלאנג־קינא־טעאטער, וועלכער הויבט זיך אָן בויען, וועגן נײַע אנ־שטאלטן אונ הײַזער, וועגן דעם פארק, וואָס עס בויט זיך, וועגן ספאָרט־פלעצער. וועגן וועלאָסיפעדיסטן, וועגן פרייַדיקן לעבן, וועגן רויִקײַט איגעם הײַנט אונ זי־כערקײַט איגעם לייכטיקן מאָרגן.

שענקער.

פאטקעוויטש יונ 1935 יאר

НА РУБЯЖЫ

Ад станцыі Радашковічы на поўдзень цягнуцца высокія зараслі кустоў. Кругом цішыня. Толькі ветрык прабягае павольна па лісточках, парушае іх спакой.

Галінкі, схіляючыся нізка, нібы шэпчуць адна другой пра нядаўнія падзеі, сведкамі якіх яны былі... Чулі яны здзекі паноў над сялянамі, пакуты стогнучых пад гнётам людзей. Хавалі яны ў сваёй гушчы чырвоных партызан, былі сведкамі баёў азвярэлых белапалякаў з чырвонымі і перамог апошніх.

Вось і зараз—на самай мяжы з капіталістычнай Польшчай аберагаюць яны вечны сон тых, што змагаліся за справу працоўных. Маладыя бярозкі нізка схілілі свае верхавінкі над брацкай магілай загінуўшых байцоў...

Ішлі гады. 1918—20 гады прынеслі змены. Белыя і чырвоныя слупы зрабілі мяжу: тут зараз мяжуюцца дзве Беларусі. Там, за белымі слупамі--засталіся памешчыкі, купцы, жандармы фашысцкай Польшчы і ранейшае прыгнечанне працоўных. Тут, за чырвонымі—тыя, хто калісьці стагнаў пад пятой памешчыка, хто ў сумных спевах выліваў сваё гора.

Зараз іншае. За чырвонымі слупамі, на ўзгорку, відаць вясёлае, новае жыццё. Панская зямля перайшла ў рукі працоўнага сялянства. Былыя ваколіцы Радашковіч змянілі свой выгляд. Няма панскага маёнтка, дзе некалі жыў пан Снітка. Ёсць калгас „Полымя“, ёсць новыя людзі—калгаснікі.

У 1930 годзе былыя панскія батракі арганізавалі калгас „Полымя“. Зараз гэта вялікая сацыялістычная гаспадарка. Налічвае яна 303 двары, 2830 гектараў зямлі. Калгас займае 50 проц. тэрыторыі Рогаўскага сельсавета, мае чатыры паказальныя фермы: конскую, дзе гадуюцца 38 маладых пародзістых жарабят; малочную, якая налічвае 484 каровы палепшанай пароды. Вясной 1935 года для фермы куплена 18 племянных галандак: Аўцаводчую—140 авечак і свінаводчую. План жывёлагадоўлі па калгасу перавыканан. У 1936 годзе павінна быць 450 галоў, а маецца ўжо зараз 484.

У кожнай брыгадзе пабудаваны ўжо тыповыя канюшні, кароўнікі, свінарнікі, кузні, будуюцца лазні. 50 проц. раённага плана будаўніцтва выканаў калгас „Полымя“. Таксама пабудаваны новыя хаты тым калгаснікам, у якіх іх не было—**Каспяровічу Максіму, Жылачу, Трычу.** Будуецца новая хата сям'і чырвонаармейца—калгасніку **Вятушка.** Праўленне вылучыла плотнікаў, сталяроў, якія хутка закончаць і гэтую хату.

У калгасе 12 брыгад. Адна ад другой не адстаюць. Адданай работай выконваюць калгаснікі лозунг любімага правадыра партыі таварыша Сталіна—„зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі“. Дружна працуюць. Ведаюць, што робяць не на пана, а на сябе. Калгас мае амаль усе сельскагаспадарчыя машыны. Сяўбу скончылі 12 мая, замест 20 па плану.

Калгасная агітбрыгада Хоцімскай МТС.

Дружныя яравыя ўсходы і зялёнае жыта, якое высокай густой сцяной стаіць насупроць чахлых мізерных палосак па той бок слупоў, сведчаць аб адданай рабоце калгаснікаў на сацыялістычных палях.

У мінулым годзе брыгада № 2 (Збаровічы) датэрмінова перавыканала ўсе сельскагаспадарчыя работы, за што брыгадзір **Трыч Язэп** палітсектарам СССР прэміраван гадзіннікам і палітсектарам БССР—веласіпедам.

Брыгадзір свінаводчай брыгады **Папсуева Насця** кажа:--На ферме працую толькі тры тыдні. Хвалюцца яшчэ няма чым, але прыму ўсе меры, каб мая брыгада па жывёлагадоўлі была першай. Забяспечу кармамі на цэлы год, даб'юся поўнага захавання маладняка.

Насця Папсуева не адна. Такіх ў калгасе „Полымя“ многа: **Івашкевіч Юлія**—58 год, яна старшая свінарка, лепшая ўдарніца па захаванню маладняка, некалькі разоў прэміравана. Лепшыя ўдарніцы—**Сліж Ганна,** Плацкая, Корзік Люба—актыўныя члены сельсавета на самай мяжы. Усе яны на чале са старшынёй калгаса тав. **Майсеенка** рабочага — вылучэнца Менскай фабрыкі імя Кагановіча, які працуе з дня арганізацыі гэтага калгаса, адданай работай паказваюць лепшыя прыклады сацыялістычных адносін да калгаса. Усе яны будуюць новую сацыялістычную вёску на стыку двух светаў.

Лозунг таварыша Сталіна аб заможнасці ў калгасе „Полымя“ ператворан у жыццё. Бескароўнасць ліквідавана. Зараз амаль кожны калгаснік гадуе цялё. У брыгадзе № 2 на 22 гаспадаркі маецца 18 цялят, тры гаспадаркі маюць пярэзімак—цёлак. Праўленне дапамагае выпайваць цялят, адвяло пасбішча для іх.

Хлеба ў калгасе хапае. У мінулым годзе пасля хлебаздачы прадалі дзяржаве 70 тон збожжа. Аб сваёй заможнасці **Сліж Ганна**—былая батрачка, кажа:

— Так ніколі не жылі, як у калгасе, усяго хапае даволі.

Шылковіч Іван заяўляе:—атрымаў на працадні каля 100 пудоў зернавых, сям'я мая—4 душы. Для пірагоў і бліноў з пшаніцы зрабіў абдзёрку. Маю 25 курэй і 10 гусей.

Разам з барацьбой за заможнасць, калгаснікі і калгасніцы не забываюць змагацца і за культурнае жыццё. У хатах калгаснікаў чыста і ўтульна, маюцца карціны, партрэты правадыроў, на вокнах чыстыя фіранкі. Каля многіх хат насаджана маладая зелень. Весела глядзець на гэтыя маладыя дрэвы. Маюцца ў брыгадах і радыёпрыёмнікі. У адной толькі брыгадзе вёскі Казберг (16 двароў) іх тры. Маюцца таксама гармоні і іншыя музычныя інструманты.

На 60 проц. калгаснікі ахоплены падпіскай на цэнтральныя газеты; сваю раённую газету „Комунар“ выпісваюць і чытаюць усе.

Вучацца ў калгасе ўсе, пачынаючы ад 8-гадовых дзяцей і канчаючы старыкамі — барадачамі. Вучацца ў школах, лікбезах, ВНУ, розных курсах. На тэрыторыі калгаса маюцца тры школы, з якіх адна няпоўна-сярэдняя.

Вось, што расказвае **Івашкевіч Рыгор** пра вучобу сваіх дзяцей:

—Мае дзеці рана пашлі вучыцца, Віця і 1 год—перайшоў у 6 групу. За гэта я яму купіў гармонь. Ён добра на ёй грае.

Калгасніцы **Пухляк, Трыч**—вучацца ў педтэхнікуме, **Пятліцкая** канчае педтэхнікум, **Драгун**—у Гідратэхнічным. Вучыцца і рад іншых калгаснікаў.

* * *

— Калгаснікі калгаса „Полымя“ актыўна дапамагаюць нам, пагранічнікам, ў ахове мяжы,—гаворыць начальнік заставы. Калгаснікі ведаюць, што мяжу трэба берагчы, як зяніцу вока. Яны памагаюць у затрыманні перабежчыкаў. Калгасніцы **Булда Ганька** і **Мамчык Марыля** за праяўленне находчывасці ў затрыманні шпіёна прэміраваны шоўкавымі плаццямі.

* * *

Вечарам у розных канцах калгаса чуюцца гукі гармоні, гітары—ліхая „полька“ і „лявоніха“. Гукі гармоні злучаюцца з галасамі моладзі. Прарэзваючы вільготнае паветра, нясуцца туды за белыя слупы бадзёрыя словы:

„стоим на страже страны труда“...

Цішыня на тым баку слупоў, моўчкі прымае гэтыя бадзёрыя спевы.

Так змяніўся твар былых прыгнечаных вёсак, дзе раней панавалі паны, так змяніліся і людзі, гатовыя ў любую мінуту абараняць сваю соцыялістычную радзіму.

Пятроўская.

Заслаўскі раён.

ШЫРОКАЕ ПОЛЕ

(Петрыкаўскі раён, калгас „Калектыўная праца“).

Мы выязджаем з густога лесу на шырокае калгаснае поле, залітае морам жыта, аўсу і ячменю. Здалёку роўнымі палосамі к нізінам збягае зялёны шаўкавісты лён. Над ім ў свежым і пахкім сонечным паветры званяць жаўранкі, гудзяць пчолы. Здаецца ўсё жывое—і травы, і птушкі, і лясы—спяваюць пад сонцам сваю няспынную песню даспяваючаму ўраджаю.

Зялёны лён выдзяляецца палосамі ў гэтым бяскрайнім ураджайным моры. Роўнымі радамі ідуць над ім брыгады палольшчыц. Яны спрытна ўвіхаюцца кожная на сваёй паласе, то выпярэджваючы адна другую, то зноў раўняючыся.

Дзяўчаты дружна ідуць папарадзе, запяваючы звонкую песню:

— А мы лён палолі, лён
Зеляненькі лён, буйны“

Жанкі падпяваюць ім і песня ад звяна к звяну шырока коціцца над калгаснымі палямі.

Тут-жа паблізу полюць ячмень і авёс. Пяць брыгад жанчын, падзеленых на звенні, працуюць сёння на поліве. Гэта іх звонкія песні разліваюцца над палямі. Не чуваць каля іх плачу дзяцей, не відно калысак. Іх малышы ў добраабсталяваных калгасных яслях і дзіцячым садзе. Калгасніцы ўпэўнены, што дзеці будуць там сытымі і дагледжанымі. Аб гэтым кажуць іх песні, бадзёрыя ўпэўненыя твары і спрытная праца на поліве.

Вось лепшыя палольшчыцы **Туравец Вера, Бамбіза Ганна, Гілюта Ольга, Жогаль Мар'я.** Яны штодзённа выполваюць сваю норму. Аб іх расказваюць брыгадзіры, як аб прыкладных работніцах не толькі ў час праполкі, але і ў час жніва. Ды ці мала такіх у калгасе. Сярод 200 калгасных гаспадарак ёсць не мала паказальных работнікаў, энтузіястаў сваёй справы.

Калгас падрыхтаваўся да ўборкі ўраджаю. 2 касілкі, 3 конных грабель ў поўнай спраўнасці. Кожная брыгада праверыла замацаваную за ёй збрую, вазы і неабходны для ўборкі інвентар, з тым, каб без усякіх затрымак выйсці на поле ў час жніва.

А жніво ў гэтым годзе будзе ўраджайнае і гарачае. Таму такой руплівасцю і стараннасцю робіцца неабходная падрыхтоўка да гэтых адказных і сапраўды гарачых работ.

Своечасова калгас падрыхтаваўся і да касавіцы. Складзена пяць брыгад, за якімі замацаваны адпаведныя участкі сенажаці. Брыгады ўжо распачалі касьбу. У гэтым годзе, упершыню у палескіх раёнах, калгас будзе практыкаваць падвойны укос травы, што значна павялічыць яго кармавыя магчымасці.

Праўленне калгаса абмеркавала план святкавання ліпеньскай гадавіны і дня ўзнагароджання БССР ордэнам Леніна. Гэтыя радасныя дні калгаснікі калгаса „Калектыўная праца“ рашылі сустрэць поўнай гатоўнасцю да ўборкі, сканчэннем пабудовы парка культуры і адпачынку і добрай лазні. У парку будуць пасаджаны дрэвы, разбіты спартыўныя пляцоўкі і пастаўлен помнік Леніну. Шмат чаго ўжо зроблена. Сумесна з сельсоветам калгас зараз праводзіць вялікую работу па планіроўцы і прывядзенню тэрыторыі калгаса ў культурны выгляд. У гэтым напрамку шмат дапамагаюць і самі калгаснікі.

Яны гавораць:

— Досыць жыць па дзядоўску. Будзем жыць культурна і радасна.

С. Дарожны.

ЯК ЖЫЛА, ЯК ЖЫВУ

Нядаўна ў нас на калгасным сходзе чыталі пісьмо кіраўцаў. Яны ўнеслі вельмі добрую прапанову—паслаць у дзень усенароднага свята — вызвалення Беларусі ад белапалякаў і ўручэння рэспубліцы ордэна Леніна,—пісьмо ад ўсіх знатных людзей нашаму самаму лепшаму настаўніку і правадыру таварышу Сталіну.

Касцюк Марыля з сваёй дачкой.

Я вельмі хвалявалася ад радасці і выказала на сходзе сваё жаданне расказаць тав. Сталіну аб тым, як я—былая батрачка, якіх у вёсцы было так многа, цяпер пры совецкай уладзе стала шчаслівейшым чалавекам.

Мне зараз 40 год, але я адчуваю сябе зусім бадзёрай і жыццерадаснай. Мінулі пакутныя, цяжкія дні горкай долі працоўнай жанчыны. Калі ўспамінаеш пра мінулае жыццё, сэрца сціскаецца ад болю, па ўсім целе пачынаюць бегаць мурашкі.

Як да нуднай песні—не хочацца варочацца да ўспамінаў аб былым галодным і разутым жыцці пры памешчыках і кулаках. Хіба-ж кулак Уэльскі, у якога я працавала больш 6 год, даваў мне хлеб? Не, ніколі. Робіш бывала ад цямна да цямна, а калі прыдзеш на кухню, то пакаёўка заяўляе:

— Сёння табе казалі хлеба не даваць, хлябай поліўку так.

— Чаму? пытала я.

— Таму, што дзіця тваё з'ела лішні блін,—адказвала яна мне.

Спала я ў сенцах, а часцяком нават і ля малатарні з граблямі ў руках. Скажаш слова, зараз Уэльскі аб гэтым даведаецца і тады спакою няма. Муж мой з гора пачаў піць і я вымушана была кінуць яго, каб не страціць таго, што „даваў" кулак Уэльскі.

Зараз мая дачка вучыцца ў школе, перайшла ў другі клас, лічыцца ўдарніцай. Ёй ужо не прыходзіцца галадаць. Мы жывем заможным, культурным жыццём.

На маіх вачах расце калгасная ферма. У гэтым годзе мы перавыканалі план камплектавання, надзялілі бескароўных цялятамі. 15 цялят прадалі калгасам „Іскра" і „Чырвоная Беларусь".

У калгасе я атрымала карову, маю авечак, свіней, гусей, агарод. Жыву ў сваёй хаце, якую калгас дапамог мне пабудаваць. Каровы калгасныя сытыя. Кожны дзень, перад выганам кароў у поле, я раю пастуху **Стэфановічу** дзе лепш папасвіць іх. Удой мы павялічылі на 4—5 літраў у дзень ад кожнай каровы.

Малакопастаўкі мы выконваем добра. За гэты год ужо разлічыліся з дзяржавай.

Раней я была цёмнай, а цяпер ліквідавала сваю непісьменнасць. Тры гады была членам свайго Байдацкага сельсовета, членам праўлення — з дня арганізацыі калгаса. Калі-б не таварышы Ленін і Сталін, я-б напэўне не бачыла такога шчасця, як цяпер, жывучы ў калгасе.

Я буду вельмі ганарыцца, калі мае словы радасці будуць гучэць на ўсю Совецкую Беларусь і пойдуць у пісьме да мудрага Сталіна.

Марыля Касцюк.

Калгас „Трудавік",
Дзяржынскага раёна.

ПАХОДНЫЯ ЯСЛІ

...В полном разгаре страда деревенская
Доля ты—русская, долюшка женская.
Вряд ли труднее сыскать
... Слышится крик у соседней полосыньки;
Баба туда—растрепалися косыньки,—
Надо ребенка качать...

Так 70 год таму назад паэт Некрасаў апісваў цяжкую падняволыную працу расійскай сялянкі пры царызме. Гэтыя пакуты памятаюць нашы калгасніцы. Многім самім прыходзілася ў самую гарачую пару цягаць з сабой у поле дзяцей, або пакідаць іх з хлебнай соскай дома на 7—8-гадовых „няняк".

Колькі пакалечаных, колькі смяротных выпадкаў сярод дзяцей прыносіў такі догляд! Зараз гэта мінулае. Густай сеткай яслей і дзіцячых пляцовак пакрыты нашы калгасы.

Жанчыны і моладзь з'яўляюцца асноўнай рабочай сілай у перадавым калгасе „Чырвоны маяк". Ад іх залежыць паспяховае правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых работ. І яны гэта разумеюць. Усе як адзін выходзяць у поле і ўдарнай работай змагаюцца за высокі соцыялістычны ўраджай.

Для нармальнай работы жанчын у калгасе створаны ўсе ўмовы: добра арганізаваны яслі і пляцоўка—45 дзяцей акружаны ўвагай і клопатамі з боку праўлення калгаса і работнікаў яслей.

Загадчыца яслей таварыш **Верамеева** вельмі добра адносіцца да работы. Дзеці сыты і дагледжаны. Чыста ў памяшканні і на дварэ. Звонка і весела раздаюцца дзіцячыя галасы.

У яслях ўстаноўлен чоткі распарадак дня. Уведзен журнал

Б А І Ч І З

наведвання ясляў медработнікамі і прадстаўнікамі партыйных і совецкіх арганізацый. У журнале адзначаюцца выяўленыя недахопы, якія таварыш Верамеева здрацу-ж выпраўляе.

Для грудных дзяцей у калгасе арганізаваны паходныя яслі — установлен фургон на калёсах, які перасоўваецца па месцы работы матак у полі. У фургоне абсталёваны дзіцячыя ложкі. Паходнымі яслямі абслугоўваюцца пяць дзяцей. Гэта дае магчымасць маткам своечасова карміць іх.

У мінулым годзе на ўсебелапускім конкурсе на лепшыя яслі Верамеева была прэміравана граматай ЦВК БССР. У гэтым годзе яна стараецца працаваць яшчэ лепш. Верамеева заключыла соцыялістычную ўмову з яслямі суседняга калгаса „Чырвоны гарадок". Яна ўнесла прапанову абвясціць і ў гэтым годзе ўсебеларускі конкурс на лепшыя яслі.



Паходныя яслі калгаса „Чырвоны маяк".

Спакойна працуюць маткі на полі. Яны ведаюць, што дзеці іх знаходзяцца ў надзейных руках.

Шалаева.

Рагачоў, Кісценёўскі сельсовет.

СТАНОВІШЧА ДЗЯЦЕЙ У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

„Будучыня польскага народу—нашы дзеці,—піша буржуазная газета „Кур'ер Варшавскі,"—галадае. Яны жывуць у лепшым выпадку талеркай супа, чаем і сухой скарынкай хлеба".

Вось як апісвае жыццё вясковых дзяцей адзін буржуазны карэспандэнт: „Мы прыбылі ў вёску. Я ўвайшоў у першую хату з края. Двое дзяцей, якія сядзелі на брудным ложку, паднялі крык і спалоханыя з плачам кінуліся на печ. Я даў дзецям па кавалку цукру, але яны ня ведалі што з ім рабіць. „Яны не ведаюць што гэта такое,"—растлумачыў мне бацька, яны яго ніколі не прабавалі."

Буржуазны друк ужо не ў стане скрыць праўды аб галечы і жабрацтве у горадзе і вёсцы.

З года ў год змяншаецца нараджаемасць. Дзеці у фашысцкай Польшчы з'яўляюцца абузай для бацькоў не таму, што працоўныя масы Польшчы не любяць, або не хочуць мець дзяцей, а таму, што ва ўмовах фашысцкай Польшчы не маюць магчымасці выхоўваць іх.

Рана канчаецца дзяцінства польскага дзіцяці. У пяць-шэсць год ён пасвіць ужо кароў на вёсцы, а ў горадзе ідзе к майстру, або правільней к жонцы майстра, якая прымушае яго рабіць усю цяжкую хатнюю работу.

Не лепшае жыццё тых „шчаслівых" дзяцей, якія пападаюць у школу. „Шчаслівых" таму, што для мільёна дзяцей наогул не хапае школ. „Не з'яўляецца тайнай,—піша „Кур'ер Віленскій",—што агульнае навучанне ў Польшчы ператварылася ў фікцыю. Якія вынікі можа даць вучоба ў неапаленых перапоўненных памяшканнях вясковых школ, якія не адпавядаюць элементарным запатрабаванням гігіены? Дзеці прыходзяць у школу галоднымі, змерзшымі і зморанымі ад далёкай дарогі". Ні аб якіх гарачых снеданнях і матэрыяльнай дапамогі працоўным дзецям няма і гутаркі ў фашысцкай Польшчы. Там урад выдаткоўвае грошы на ваенныя падрыхтаванні, на турмы, паліцыю, толькі не на выхаванне дзяцей.

Асабліва цяжкае становішча дзяцей у Заходняй Беларусі і ў Заходняй Украіне. Фашысцкі ўрад хоча сілай прымусіць дзяцей гаварыць па-польску. З гэтай мэтай закрылі ўсе беларускія і украінскія школы. Дзяцей прымушаюць ісці вучыцца ў польскія школы. За ўсякія размовы на роднай мове дзяцей б'юць і караюць. Не лічацца з тым, што дзеці, у прыватнасці сямігадовыя, сядзяць як глуханямыя, не разумеючы, што настаўніца ім гаворыць.

Фашысцкі ўрад агнём і тэрорам праводзіць паланізацыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Але, як відаць, усе гэтыя меры не даюць чаканых вынікаў.

Польскія дзеці нараўне з сваімі бацькамі і маткамі, нараўне з сваімі братамі і сёстрамі вядуць барацьбу супроць фашысцкага ўрада, супроць акупанцкага ўціску на Заходняй Беларусі. Найбольш свядомыя з іх належаць да „Піонера". Дзяцей з „Піонера" вы можаце сустрэць усюды. І пры забастоўках, і расклейваючых адозвы, і на дэманстрацыях, і ў радах „чырвоных ганцоў".

Асабліва ўпорную барацьбу правялі дзеці ў мінулым годзе ў Заходняй Беларусі за школу на роднай мове. Хваляй школьных забастовак былі ахоплены Гродненскі, Слонімскі і Навагрудскі акругі. 19 сакавіка, у дзень імянін Пілсудскага, калі дзяцей прымушалі дэманстраваць з нацыянальнымі сцягамі, у многіх вёсках дзеці зрывалі белую паперу і дэманстравалі з чырвонымі сцягамі, а замест польскага гімна пелі рэволюцыйныя спевы. Фашысцкі ўрад распраўляецца са змагаючымі дзецьмі не менш жорстка, чым з іх бацькамі. Катаванні, збіенні ў дэфензіве, нават турма не мінуюць іх.

Надыходзячая пераможная пролетарская рэволюцыя, якая прынясе соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўным масам Польшчы, адкрые шырокі шлях да развіцця усім прыгнечаным, польскім дзецям, як гэта зрабіла 17 год таму назад Окцябрская рэволюцыя ў нас, у Расіі.

Л. Майская

Цана асобнага нумара 20 кап.

Выданне ЦК КП(б)Б

Ч. В. А. адказнага рэдактара М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая 68, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Друкарня ім. Сталіна. Заказ № 637. Тыраж 9.145 Галоўлітбел № 2896.

Здана ў набор 27/VI—35 г. Падпісана да друку 7/VII—35 г. У нумары 2½ арк. 120.000 друк. знакаў.